# У БЛІЖЭЙШЫМ ФАРМАЦЕ

## Прэзідэнт мяняе стыль і тактыку рабочых паездак

**Рабочыя паездкі Прэзідэнта па рэгіёнах краіны набылі новы фармат. «Больш пільна, уважліва вывучыць сітуацыю на месцах», — так патлумачыў задуму гэтых паездак сам кіраўнік дзяржавы, адзначыўшы пры гэтым, што падставай для правядзення нарад з выездам у рэгіёны служаць не нейкія надзвычайныя абставіны. «На кожным месцы мяне цікавіла тая ці іншая праблема, — сказаў Прэзідэнт. — Кантраляваць выкананне ключавых паказчыкаў эфектыўнасці работы, якія прапісаны ў «Матрыцы задач для вертыкалі ўлады», я буду пастаянна. Хачу проста папярэдзіць, ніхто ні ў якім разе не запалохваючы: усе рашэнні, якія я прымаю тут на месцы, павінны няўхільна выконвацца, чаго б гэта ні каштавала — і ўраду, і губернатару, і кіраўнікам прадпрыемстваў».**

Не менш важная падстава быць на месцах, паводле слоў Прэзідэнта, — кантроль за ходам работ, якія праводзяцца. «Я разумею, што кожны губернатар і старшыня райвыканкама знойдуць, што паказаць. Але калі я буду глядзець толькі на прыгожае, то ўсё, што за кадрам застанецца, можа не атрымаць свайго развіцця», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Гэтыя прынцыпы Прэзідэнт агучыў падчас учарашняй рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць. А першай у шэрагу паездак новага фармату ў суботу стала Гродзеншчына. Аляксандр Лукашэнка пачаў рабочую паездку не з наведвання канкрэтных прадпрыемстваў, а з аналізу сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна. Кіраўніка дзяржавы турбавала, што ў такім моцным рэгіёне, як Гродзеншчына, па выніках першага паўгоддзя не выкананы пяць з васьмі ключавых паказчыкаў эфектыўнасці працы. Падчас нарады адбылася грунтоўная і дэталёвая размова аб недапрацоўках і праблемах, якія існуюць у вобласці. Сваё бачанне сітуацыі выклалі кіраўнікі ведамстваў, вобласці і раёнаў, а таксама некаторых прадпрыемстваў, дзе маюцца пэўныя пытанні з выкананнем прагнозных паказчыкаў.

Як адзначыў на нарадзе Прэзідэнт, каб даведацца, якія праблемы існуюць у рэгіёнах, ён наведвае як перадавыя, так і адсталыя прадпрыемствы. Адразу ж пасля нарады кіраўнік дзяржавы наведаў стратны Ваўкавыскі завод дахавых і будаўніча-аддзелачных машын, што не было прадугледжана праграмай рабочай паездкі. На прадпрыемстве Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з турэцкім інвестарам, які хацеў бы набыць праблемны завод. Прэзідэнт паабяцаў яму падтрымку пры ўмове, што «вы за два гады прывядзяце тут усё ў парадак, паставіце высокатэхналагічнае абсталяванне і пачняце выпрацоўваць экспартна арыентаваную прадукцыю». Незапланаваным стала і наведванне кіраўніком дзяржавы адной з лепшых гаспадарак рэгіёна «Хацькаўцы», у прыватнасці малочнатаварных ферм «Янава» і «Рупейкі».

На Брэстчыне правесці нараду ў Маларыцкім раёне, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, вырашылі невыпадкова: гэты рэгіён у ліку адстаючых па шэрагу пазіцый. Прэзідэнт заўважыў, што ў цэлым у Брэсцкай вобласці не выкананы чатыры з васьмі ключавых паказчыкаў эфектыўнасці.

Падчас наведвання Маларыцкай райаграпрамтэхнікі, Прэзідэнт зазначыў: «Ні ў якім разе нельга разбураць тую інфраструктуру, якая некалі была створана. Мы яе павінны адрадзіць ва ўсіх раёнах». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такія абслуговыя арганізацыі арыентаваны не толькі на сельгаспрадпрыемствы, але і на ўвесь раён у цэлым, у тым ліку фермераў, асобных грамадзян. «Гэта ў старшыні райвыканкама павінен быць магутны сродак кіравання», — сказаў кіраўнік дзяржавы, гаворачы пра ролю райаграсэрвісу. Паводле слоў Прэзідэнта, перш за ўсё ў райаграсэрвісах неабходна дакладна вызначыцца з коштам тых ці іншых паслуг, каб цана была канкурэнтаздольная і прывабная для патэнцыяльных заказчыкаў. Акрамя таго, важна пашыраць іх пералік.

У час наведвання Маларыцкай райаграпрамтэхнікі Аляксандр Лукашэнка выказаў немалую долю крытыкі наконт знешняга выгляду і ўтрымання вытворчых памяшканняў і да 1 студзеня даручыў навесці тут парадак.

У Маларыцкім раёне Прэзідэнт таксама наведаў сельгаспрадпрыемства «Савушкіна», дзе назіраецца абсалютна іншая карціна з пункту гледжання гаспадарлівага падыходу і арганізацыі вытворчага працэсу. Прадпрыемства працуе з прыбыткам і ўстойліва развіваецца. «Тут размова ішла не толькі аб рабоце гэтага паспяховага прадпрыемства, але і аб праблемных сельгасарганізацыях раёна, шляхах павышэння эфектыўнасці іх работы. Прэзідэнт падрабязна цікавіўся рознымі тэхналагічнымі працэсамі.

У час наведвання адной з ферм сельгаспрадпрыемства «Савушкіна» Аляксандру Лукашэнку падарылі карову для асабістай падсобнай гаспадаркі. Прэзідэнт з удзячнасцю прыняў падарунак.

* * *

Падчас паездкі Прэзідэнт паразмаўляў з жыхарамі Маларыты. Людзей цікавілі пытанні зарплаты і цэн.

«У Беларусі толькі лянівы можа не зарабіць. Мы што, ваюем, вайна ў нас ідзе або яшчэ штосьці?.. Трэба проста крыху варушыцца», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што кожнаму, перш за ўсё, неабходна разлічваць на сябе. «Вы павінны разумець, што ніхто з ніадкуль грошы не возьме», — сказаў ён.

Разам з тым Прэзідэнт падкрэсліў, што дзяржава заўсёды акажа падтрымку тым, каму яна сапраўды неабходна. «Дапамагаць мы будзем. Калі вы зробіце крок, мы зробім насустрач крок (я маю на ўвазе ўсю краіну). А калі вы будзеце, апусціўшы рукі, сядзець і глядзець, што нехта вам штосьці прынясе, то, ведаеце, дапамагаюць таму, хто сам гэтага хоча», — заявіў беларускі лідар. Прэзідэнт адзначыў, што ў плане аказання дапамогі і падтрымкі ў прыярытэце ў дзяржавы шматдзетныя сем'і. «Для нас дэмаграфічная бяспека — гэта пытанне нумар адзін», — сказаў ён. Яшчэ адна катэгорыя — ваенныя. «Ваенных трэба падтрымліваць, таму што яны не могуць зарабіць недзе на баку», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы пра цэнавую палітыку ў краіне, Прэзідэнт заўважыў: «Галоўнае, каб не было цэнавага перакосу: калі няма магчымасці ўзняць зарплату, каб цэны ў гэты час не раслі. Калі гэта ёсць — гэта вялікі недахоп. Цэны расці не павінны цяпер, мы з вамі ўжо вызначыліся».

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што адна з самых галоўных задач для дзяржавы — забяспечыць людзей работай. «Сваё шчасце трэба шукаць на сваёй зямлі. Гэта галоўная мая задача, — упэўнены беларускі лідар. — Мы павінны зрабіць, каб і пасля нас людзі жылі нармальна і працавалі, — гэта галоўная мая задача. Не зарплаты даць, не ў калгас паехаць і нешта там зрабіць. Дзяржава павінна адказваць за дарогі, меліярацыю, ахову здароўя, адукацыю... А вось хадзіць па фермах і прадпрыемствы раскручваць — гэта не дзяржаўная функцыя. Гэта мы трапілі ў такую сітуацыю, таму даводзіцца займацца гэтымі прадпрыемствамі».

**Паводле БЕЛТА.**

■ Жніво-2016

# НА ФІНІШНАЙ ПРАМОЙ

### САМАЯ ВЫСОКАЯ ЎРАДЖАЙНАСЦЬ — НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

**Уборачная кампанія падыходзіць да свайго завяршэння. Аграрыі краіны ўжо сабралі больш за 6,2 млн тон збожжа. Збожжавыя і зернебабовыя ў Беларусі сабраны з 82,2% плошчаў. Ураджайнасць збожжа дасягае 34,3 ц/га.**

Згодна з аператыўнай інфармацыяй Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання на 15 жніўня, лідзіруюць гаспадаркі Мінскай вобласці, дзе сабрана больш за 1,6 млн тон збожжа. На Брэстчыне намалацілі больш за 1,1 млн тон. У Гомельскай і Гродзенскай абласцях таксама перасягнулі паказчык у 1 млн тон збожжа.

Так, на Гомельшчыне агульны намалот збожжа ў вобласці на раніцу 15 жніўня склаў 1 млн 23 тыс. тон, што амаль на 50 тыс. тон перавышае ўвесь ураджай, сабраны летась. Чакаецца, што больш, чым летась будзе сабрана збожжа і ў большасці раёнаў. Збожжа сабралі на плошчы 325,7 тыс. га, што складае 93,6% да плана.

Цалкам завяршылі ўборку ў шасці раёнах паўднёвай і цэнтральнай частцы вобласці. Зараз тэхніка з гэтых раёнаў накіраваная да суседзяў, каб дапамагчы ім хутчэй завяршыць работы на палях. Сярэдняя ўраджайнасць збожжа па вобласці складае 31,4 ц/га, што на 2,2 ц/га вышэй за леташні ўзровень. Варта таксама адзначыць, што ў некаторых раёнах Гомельскай вобласці, а менавіта на паўднёвым усходзе, зноў адчуваўся недахоп вільгаці для нармальнага развіцця раслін. Аднак аграрыі Гомельшчыны ўпэўнены, што ўжо сабранага збожжа будзе дастаткова, каб выканаць дзяржзаказ і забяспечыць патрэбы жывёлагадоўлі.

Менш чым па мільёне сабралі на Магілёўшчыне і Віцебшчыне — 852,5 і 536,3 тыс. тон адпаведна. Таксама вядома, што ў цэлым па гаспадарці паставілі ў лік дзяржзаказу 727,7 тыс. тон збожжа, або 67% да плана.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*




# ЁСЦЬ МІЛЬЁН

**На раніцу 15 жніўня хлебаробы Гродзеншчыны намалацілі 1 028 341 тону збожжа, убраўшы 79% плошчаў.**

Згодна з інфармацыяй абласнога ўпраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага аблвыканкама, 25 гаспадарак (у тым ліку 7 у Слонімскім раёне, 6 — у Гродзенскім) жніво завяршылі, а многія набліжаюцца да фінішу. Па ўраджайнасці традыцыйна лідзіруе Гродзенскі раён — 60,4 цэнтнера з гектара. На Берастаўчыне на круг намалочваюць у сярэднім 51,1, у Карэліцкім раёне — 47,7 цэнтнера з гектара. Сярод гаспадарак самая ўраджайная ніва ў СВК імя В.І. Крамко Гродзенскага раёна — 93,1 цэнтнера з гектара. У сельскагаспадарчых кааператывах «Прагрэс-Верцялішкі» і «Свіслач» гэтага ж раёна ўраджайнасць складае адпаведна 83,6 і 79,5 цэнтнера з гектара. Больш за 60 цэнтнераў збожжа з гектара намалочваюць яшчэ ў дзесяці гаспадарках вобласці.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by/*

# ПОСПЕХ ДЫКТУЮЦЬ ТЭХНАЛОГІІ

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ павіншаваў першых "тысячнікаў" жніва. У Докшыцкім раёне на адным полі больш за 1000 тон збожжа намалацілі адразу два экіпажы.**



Героямі ўрачыстасці сталі два экіпажы Докшыцкага райаграсэрвіса. Самы вопытны сярод сёлетніх «тысячнікаў» — Уладзімір Лаўцэвіч.

— Для мяне гэта ўжо дваццаць сёмае жніво, — гаворыць Уладзімір Пятровіч. — Дванаццаць разоў мой актыўны ўдзел на ўборцы быў адзначаны на рэспубліканскіх «Дажынках». Там двойчы з дасягненнямі павіншаваў асабіста Прэзідэнт. Мой уласны рэкорд — 2860 тон, якія намалаціў гадоў шэсць таму. Сёлета працуем у экіпажы з Уладзімірам Ваховічам і мяркуем, што жніво завершым у самыя кароткія тэрміны і, безумоўна, з добрай якасцю.

Маладыя «тысячнікі» — Віктар Суднік і Сяргей Каляга — адсталі ў той дзень ад экіпажа Лаўцэвіча толькі на 32 тоны.

— Прачынаемся ў 5.30, а восьмай гадзіне раніцы ўжо ў кабіне камбайна. У сярэднім у дзень намалот пад 70 тон. У лепшыя дні бывае і па 100. Тэхніка надзейная. Асаблівa праблемных паломак няма, — расказвае старшы камбайнер Віктар Суднік.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарстнёў уручыў «тысячнікам» плазменныя тэлевізары і мультыварку. А старшыня Докшыцкага райвыканкама Алег Пінчук — грашовыя прэміі. Губернатар пажадаў камбайнерам моцнага здароўя, добрага настрою і сіл выехаць у камандзіроўкі ў праблемныя раёны, бо амаль палова збожжавых у паўночным рэгіёне яшчэ не абмалочана.

Падчас гутаркі з кіраўніцтвам раёна і гаспадарк губернатар адзначыў, што сёлета пераменлівае надвор'е перашкаджае. Вясна была вельмі цяжкая. Губернатар не раз падкрэсліваў, што гарантыя добрых вынікаў — прытрымліванне тэхналогій на ўсіх этапах работы на зямлі.

Карэспандэнт «Звязды» папрасіў удакладніць: што ж трэба зрабіць, каб тэхналогіі прымяняліся паўсюль?

— Каб выконваць тэхналогію, трэба ўсё мець: тэхніку і сельгасмашыны, угнаенні, сродкі хімічнай абароны. Спецыялісты ведаюць, як і што рабіць. Але не хапае тэхнічнага забеспячэння. Перш за ўсё трэба тэхнічна пераўзброіцца. Другі момант: вобласць — зона рызыкоўнага земляробства з абмежаваным перыядам вырошчвання сельскагаспадарчых культур. Таму за вельмі кароткі час павінны зрабіць усё, што патрабуецца ад тэхналогіі, — разважае старшыня аблвыканкама.

Ён адзначыў, што летась машынны парк папоўнілі 850 трактараў айчыннай вытворчасці. Гэта добрая падтрымка механізатарам.

Сёлета абласныя «Дажынкі» на Віцебшчыне пройдуць у Сенненскім раёне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

*Докшыцкі раён*

■ Надвор'е

# Лета вернецца на выхадных

**А да пятніцы абавязковымі атрыбутамі для выхаду на вуліцу стануць куртка і парасон. Атмасферныя франты будуць прыносіць з паўночнага захаду халаднаватае дажджлівае надвор'е. Пра гэта паведамілі ў Белгідраметцэнтры.**

Сёння на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Слупкі тэрмометраў пакажуць у разгар дня ўсяго 14-19 градусаў цяпла, і толькі па поўдні чакаецца да плюс 22.

У сераду і чацвер удзень пацяплее прыкладна на 1-2 градусы. А вось ночы чакаюцца ўжо халаднаватыя — усяго ад 6 да 13 цяпла. Кароткачасовыя дажджы прагназуюцца па-ранейшаму на большай частцы краіны.

Па папярэдніх разліках, з пятніцы ў Беларусь вернецца лета. Атмасферны ціск падрасце, а дажджоў стане прыкметна менш. Услед за гэтым пацяплее і ўдзень: сіноптыкі прагназуюць ад плюс 20 па поўначы да плюс 29 на поўдні. На выхадных слупок тэрмометра ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях пяройдзе 30-градусную адзнаку.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*